# ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА

## ПРЭЗІДЭНТ ЛІЧЫЦЬ НЕАБХОДНЫМ МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЕ РЭСУРСЫ І СІЛЫ ДЛЯ ЎЗДЫМУ ЭКАНОМІКІ

**Учора Аляксандр Лукашэнка правёў нараду аб праектах прагнозу, бюджэту і грашова-крэдытнай палітыкі на 2016 год, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што год будзе праходзіць ва ўмовах жорсткіх бюджэтных абмежаванняў. «Нам трэба забяспечыць макраэканамічную стабільнасць, пры гэтым выканаць усе абавязацельствы перад людзьмі, — падкрэсліў беларускі лідар. — Як і было абяцана, прыярытэт у эканоміцы — гэта чалавек. Ахова здароўя, адукацыя, сацыяльная абарона. Мы будуем эканоміку ведаў. Значыць, нашы прыярытэты — таксама навука і перадавыя, найноўшыя тэхналогіі».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы заўважыў, што «пакуль больш размоў, чым справы».

«Беларусь — суверэнная краіна. Таму вырашэнне існуючых праблем у эканоміцы ў першую чаргу залежыць ад нас саміх, ад таго, як мы працуем, наколькі ўмела гандлюем і эфектыўна прасоўваем сваю прадукцыю як унутры краіны, так і на знешніх рынках», — адзначыў Прэзідэнт.

Патрабуючы мабілізаваць усе сілы для ўздыму эканомікі, Аляксандр Лукашэнка хацеў бы пачуць дакладны адказ на пытанне, на што разлічваюць урад і Нацыянальны банк. «На буйныя прадпрыемствы і новыя праекты? Або будзем чакаць, калі скончыцца паласа непрыемнасцяў у сусветнай эканоміцы?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт запатрабаваў ад урада стварыць такія ўмовы вядзення бізнесу, каб «інвестары самі прыходзілі да нас, самі неслі грошы, а не іх шукалі». Аляксандр Лукашэнка звярнуў асаблівую ўвагу кіраўнікоў аблвыканкамаў на гэту праблему. «Вы несяце персанальную адказнасць за эфектыўнае развіццё рэгіёнаў. Прыярытэты абазначаны для ўсіх, і іх трэба прытрымлівацца няўхільна».

Сітуацыю ў эканоміцы Прэзідэнт ахарактарызаваў як складаную — «сёння ў свеце амаль вайна ідзе». Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Трэба мабілізоўвацца вядомымі метадамі, якімі мы ўмеем дзейнічаць, разумеем іх. Трэба грунтавацца на іх і дзейнічаць, а не падкідваць розныя эксперыменты».

«Інфляцыю ўдалося скараціць, але гэтага недастаткова. Трэба больш энергічна яе зніжаць — выходзіць на адназначныя паказчыкі. Тады і будуць макраэканамічная стабільнасць і ўмовы для змяншэння працэнтных ставак па крэдытах», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на сённяшняй нарадзе трэба будзе абмеркаваць найважнейшыя пытанні дзяржаўнай эканамічнай палітыкі хаця б на наступны год. «Усіх, вядома ж, хвалюе пытанне — што будзе далей, якім шляхам будзем ісці. Хацелася б пачуць ад урада і адпаведных службовых асоб, што прапануецца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Зразумела, час мяняецца, і да гэтага часу трэба, перш за ўсё, прыстасоўвацца. Трэба прыстасоўвацца, але не цягнуцца ў хвасце падзей, а імкнуцца да таго, каб гэтыя падзеі, наколькі гэта магчыма, зрабіць карыснымі для нашай краіны і нашага народа, прымаючы адэкватныя захады і выстаўляючы ідэі для падрыхтоўкі рэальных планаў. А для гэтага трэба мабілізоўваць існуючыя сілы і рэсурсы».

Разам з тым Прэзідэнт заўважыў, што, перш чым планаваць будучы год, неабходна прааналізаваць бягучую сітуацыю і ацаніць базу, ад якой адштурхоўвацца, з чаго зыходзіць, строячы планы і дзеянні ў наступным годзе. Ён таксама адзначыў, што ўрад дакладвае: у цэлым стабільнасць захавана, у поўным аб'ёме і ў тэрмін краіна разлічваецца па ўсіх дзяржаўных абавязацельствах і валютных пазыках. «Гэта добра, але самае галоўнае — каб у будучыні не залязаць у даўгі; трэба, каб развівалася эканоміка», — перакананы Прэзідэнт.

Аднак кіраўнік дзяржавы канстатаваў: «Сітуацыя на многіх прамысловых прадпрыемствах застаецца складанай, калі не сказаць горш». Намецілася адмоўная дынаміка ў сельскай гаспадарцы і гандлі, недабірае будаўнічая галіна, скарачаецца экспарт, знізіліся інвестыцыі, адзначыў ён.

Як лічыць Прэзідэнт, вядома ж, негатыўную ролю тут адыгрываюць вонкавыя фактары, аднак не варта ўсё спісваць толькі на іх. «Ёсць нямала ўнутраных рэзерваў, якія слаба выкарыстоўваюцца як у зніжэнні сабекошту прадукцыі, укараненні новых тэхналогій, так і ў кіраванні прадпрыемствамі, — выказаў меркаванне Аляксандр Лукашэнка. — Я сказаў бы так: калі на эканоміку ўплываюць знешнія фактары ў памеры 100 працэнтаў, то як мінімум 30 працэнтаў — гэта наша».

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што беларуская эканоміка абсалютна канкурэнтная па цэнавым фактары і якасці. «Цудаў не бывае, у крызісны час мы не можам, нават калі захочам, стварыць новую эканоміку, гэта значыць замест нашага машынабудаўнічага комплексу, напрыклад, вырабляць нешта касмічнае. Не зможам — ды і не трэба. У нас добрыя людзі, адукацыя, прамысловая школа. Трэба крыху варушыцца, напружвацца», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Мы не павінны дзейнічаць, каб дагадзіць каму-небудзь, міжнародная супольнасць гэта, Міжнародны валютны фонд, Расія ці іншыя дзяржавы. Мы ніколі нікому не стваралі праблем», — прадоўжыў Прэзідэнт. Пры гэтым Беларусь разлічвае на дапамогу і падтрымку з боку міжнароднай супольнасці перш за ўсё ў эканоміцы, і толькі ў эканоміцы. «Не трэба больш ніякай падтрымкі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Беларусь разлічвае таксама на падтрымку Расіі, дружалюбнай, брацкай дзяржавы. Так, Прэзідэнт адзначыў, што на прадпрыемствах Расіі, якія маюць кааперацыйныя сувязі з Беларуссю, працуюць 10 млн расіян.

# АДБУДЗЕЦЦА ВІЗІТ ПРЭЗІДЭНТА Ў В'ЕТНАМ І ТУРКМЕНІСТАН

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 8-12 снежня зробіць афіцыйныя візіты ў Сацыялістычную Рэспубліку В'етнам і Туркменістан. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Праграмай візіту Прэзідэнта Беларусі ў В'етнам запланаваны перагаворы з Прэзідэнтам Чыонг Тан Шангам, сустрэчы з генеральным сакратаром Камуністычнай партыі Нгуен Фу Чонгам і прэм'ер-міністрам Нгуен Тан Зунгам.

Праграма наведвання Туркменістана таксама насычана сустрэчамі і мерапрыемствамі. Аляксандр Лукашэнка правядзе перагаворы з Прэзідэнтам Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедавым, па выніках якіх будзе падпісаны шэраг міжнародных дакументаў. Чакаецца, што Прэзідэнт Беларусі наведае сумесную беларуска-туркменскую выстаўку-кірмаш, Алімпійскі гарадок.

Кіраўнік беларускай дзяржавы таксама прыме ўдзел у міжнароднай канферэнцыі «Палітыка нейтралітэту: міжнароднае супрацоўніцтва ў імя міру, бяспекі і развіцця».

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**9 снежня 2015 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне дзясятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

■ Парламенцкі дзённік

# НАПРАЦОЎКІ ЁСЦЬ, ЗАСТАЛОСЯ ІХ СІСТЭМАТЫЗАВАЦЬ

**Парламентарыі нашай краіны і Эстоніі ўпэўнены: неабходна аднавіць прамыя авіязносіны паміж дзяржавамі. Падчас сустрэчы парламенцкай дэлегацыі Эстоніі з прадстаўнікамі Нацыянальнага сходу абмяркоўваліся перспектывы не толькі парламенцкай дыпламатыі, але і магчымасці ўдасканалення эканамічнага ўзаемадзеяння.**

— Парламенцкае ўзаемадзеянне паміж нашымі краінамі, нягледзячы ні на якія абставіны, даволі паспяховае, — адзначыў **Віктар ГУМІНСКІ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Парламента нашай краіны.** — Можна было б казаць, што яно вельмі паспяховае, калі б мы падштурхоўвалі нашы ўрады да яшчэ большага супрацоўніцтва, былі ініцыятарамі ў такім напрамку, як развіццё эканамічных стасункаў.

Віцэ-спікер звярнуў увагу на значнае зніжэнне тавараабароту: за перыяд са студзеня па верасень ён склаў 89 мільёнаў долараў. Для параўнання — у 2011 годзе нашы краіны нагандлявалі на 650 мільёнаў долараў.

Народная дыпламатыя паміж Беларуссю і Эстоніяй развіваецца больш як 10 гадоў. Пра гэта нагадаў кіраўнік эстонскай дэлегацыі **Валерый КОРБ, член камісіі Дзяржаўнага сходу Эстонскай Рэспублікі па ахове навакольнага асяроддзя, кіраўнік групы дружбы парламента Эстоніі з парламентам Беларусі.** Як правіла, такое супрацоўніцтва адбываецца перш за ўсё на ўзроўні рэгіёнаў: 11 гадоў таму быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж гарадамі Салігорск і Кохтла-Ярве. Па словах эстонскага дэпутата, дзяржавам надышоў час пераходзіць з рэгіянальнага ўзроўню супрацоўніцтва на больш высокі — міждзяржаўны.

**Мікалай ІВАНЧАНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы, кіраўнік працоўнай групы Нацыянальнага сходу нашай краіны па супрацоўніцтве з парламентам Эстоніі,** лічыць, што ўстаноўленне прамых авіязносін паскорыць працэсы развіцця беларуска-эстонскіх стасункаў.

— Некалі такія рэйсы былі, — нагадаў дэпутат. — У тым, што іх трэба аднавіць, упэўнены і нашы паслы — Анатоль Стэпусь, Пасол Беларусі ў Эстоніі, і Майт Марцінсан, пасол Эстоніі ў Беларусі. У стасунках паміж нашымі краінамі неабходна выходзіць на новы этап. У нас ёсць кантакты па лініі сельскай гаспадаркі, экалогіі, жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Сёння неабходна сістэматызаваць усе гэтыя напрацоўкі.

Што да перспектыў, то Эстонія валодае вельмі цікавым вопытам выкарыстання адходаў. Яшчэ некалькі гадоў таму ў краіне колькасць звалак перавышала дзве сотні, сёння ж працуюць буйныя комплексы па перапрацоўцы камунальных адходаў. Па словах Мікалая Іванчанкі, нашай краіне цікавы гэты вопыт.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ВІЦЕБСКІ ФЕНОМЕН

## Як павысіць зарплату педагогам?

**У Полацку парламентарыі абмяркоўвалі тэмы, якія, безумоўна, хвалююць педагогаў. Размова ішла і пра магчымасці павышэння заробку.**



Цікава, што калі ў цэлым па краіне зарплата педагагічных работнікаў ніжэйшая за сярэднюю, на Віцебшчыне — наадварот. У выязным пасяджэнні бралі ўдзел і члены прэзідыума ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

У краіне з прыкладна 235 тысяч педагагічных работнікаў амаль 100 тысяч выкладаюць у школах.

— А ўсяго на сёння ў адукацыі і навуцы працуюць прыблізна 400 тысяч чалавек — каля 10% з усіх занятых у эканоміцы. Наконт фінансавання: прыкладна кожны пяты бюджэтны рубель трапляе на нашу сферу, — канстатаваў **Анатоль КУЧЫНСКІ, начальнік інфармацыйна-аналітычнага аддзела Міністэрства адукацыі Беларусі.**

У наступным годзе грошай выдаткуюць на адукацыю і навуку больш, чым сёлета. Зразумела, што педагогам хочацца за старанную працу атрымліваць добрую зарплату.

— У цэлым па краіне на сёння ў педагагічных работнікаў месячная сярэдняя зарплата большая за 5,4 мільёна рублёў — 82% ад узроўню сярэдняй. У школьных настаўнікаў перавышае 5,7 мільёна (86%). У Віцебскай вобласці зарплата ў педагогаў большая за 5,6 мільёна (97,5% ад сярэдняй). А ў настаўнікаў яна перавышае 6 мільёнаў рублёў — гэта 103,7% у адносінах да сярэдняй зарплаты ў рэгіёне. Досвед Прыдзвінскага краю цікавы. І яго трэба пераймаць, — адзначыў **Аляксандр СЯГОДНІК, старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы.**

«Сакрэт» Віцебшчыны тлумачыцца ў тым ліку і мэтанакіраванай працай з органамі мясцовай улады, аддзеламі адукацыі.

— Прэзідэнцкі Дэкрэт № 29 («Аб дадатковых мерах па ўдасканаленні працоўных адносін, умацаванні працоўнай і выканаўчай дысцыпліны». — **Аўт.**) дае магчымасць і для павелічэння зарплаты. Напэўна, кіруючыя работнікі прoста не ўнікалі ў нюансы і не ведалі гэтую асаблівасць... Заробак, вядома, павышаецца і пры здачы на вышэйшую і першую кваліфікацыйныя катэгорыі. Цяпер у нашай вобласці 79,5% настаўнікаў з гэтымі катэгорыямі — самы высокі паказчык у краіне. Грошы, якія застаюцца пасля рэарганізацыі і рэструктурызацыі сістэмы адукацыі, таксама выкарыстоўваюцца для павелічэння зарплаты, — падзяліўся вопытам **Іван ШЧУРОК, начальнік упраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама.**

Трэба правільна і актыўна прымяняць усе магчымыя формы для стымулявання працы педагогаў.

— Ніякага «віцебскага феномену» няма. Нам задаюць пытанні калегі з іншых рэгіёнаў. Цікавяцца, як у няпростых эканамічных умовах атрымліваецца захаваць узровень заработнай платы і забяспечыць станоўчую дынаміку росту. Гэта дазваляюць рабіць вышэйзгаданы Дэкрэт, атэстацыя, накіраванне грошай на прэміраванне ў выніку эканоміі планавага фонду зарплаты... Натуральна, вызначыць гэтыя напрамкі было параўнальна проста. А вось іх рэалізацыя — больш складаная справа, — канстатаваў **Аляксандр СУХАНАЎ, старшыня Віцебскага абласнога камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.**

Шмат надзей на прынясце дапаўненняў да Кодэкса аб адукацыі. Запланаваны змены ў падыходах да разліку фінансавання ўстаноў адукацыі. Па-новаму будзе разлічвацца эканомія бюджэту за кошт аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі.

— І на гэтай аснове з'явяцца іншыя ўжо афіцыйныя крыніцы росту зарплаты для работнікаў галіны. А пакуль мы вымушаны чакаць прывядзення тарыфнай стаўкі 1-га разраду ў адпаведнасці з мінімальнай заработнай платай... Чакаем і прыняцця рашэння на тарыфікацыю гадзін педагагічным работнікам, занятым на суправаджэнні дзяцей пры падвозе на заняткі ў школу і дадому. Гэтае пытанне актуальнае для ўсіх рэгіёнаў. Штодня ў краіне на падвозе дзяцей занята звыш 1,1 тысячы аўтобусаў... — дадаў Аляксандр Суханаў.

І платныя паслугі, вядома, даюць магчымасць дадаткова зарабляць настаўнікам. Але не ўсё так проста.

— Калі змяніць сістэму платных паслуг, можна значна павысіць зарплату. Ведаю, што пакуль што настаўнік не хоча займацца платнымі паслугамі. Бо ён павінен гэта рабіць прымусова, выконваючы загад. Лічу, што аптымальны варыянт, калі з платы за паслугі 40% налічвалася б настаўніку. І, па маіх падліках, спакойна, без асаблівай нагрузкі, настаўнік у выніку можа дадаткова зарабіць пад 3 мільёны рублёў. А калі грошы, атрыманыя ад аказання паслуг, пералічваюць у раённы аддзел адукацыі, гэта, прабачце, як у бяздонную бочку... І не трэба ніякіх адпаведных планаў даводзіць, — падзяліўся думкай **Міхаіл ВОЛКАЎ, намеснік старшыні пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы.**

Вельмі эмацыйным было выказванне прадстаўніка прафсаюза.

— Трэба вызваліць школы ад збору другаснай сыравіны! Спачатку «сеюць», а потым «збіраюць ураджаі» металалому і макулатуры? І абавязкова пры гэтым трэба выканаць даведзенае заданне! Думаю, прыйшоў час адысці ад гэтай практыкі, — сказаў **Сяргей ВІНАГРАДАЎ, старшыня Магілёўскага абкама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.**

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

*Полацк — Віцебск.*